БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 6 лістапада 1997 года, чацвер, № 14 (1769)

Афіцыйна

"Статут — гэта наша канстытуцыя..."

Некалькі дзён таму ва універсітэце праходзіла пасяджэнне Вучонага савета Белдзяржуніверсітэта. Асноўнае пытанне, якое абмяркоўвалася на ім, — праект статута БДУ. Нагадаем, што праца над гэтым важным дакументам пачалася даўно — амаль год таму.

Члены Вучонага савета ўнеслі шмат прапаноў і заўваг па статуту. Напрыклад, было прапанавана дэкана выбіраць на факультэтах і прадстаўляць рэктару для зацвярджэння. Рэктара — таксама выбіраць шляхам галасавання. А пасаду першага прарэктара і прарэктара па навуцы ўзгадняць з Саветам Міністраў, таксама, як рэарганізацыю ці ліквідацыю асобных структур універсітэта. Выклікалі заўвагі і тыя выпадкі, калі студэнт можа быць адлічаны. Згодна з праектам, гэта можа здарыцца, акрамя іншага, і пасля адміністратыўных правапарушэнняў. Як заўважылі юрысты, падставай можа быць, напрыклад, пераход вуліцы не па правілах дарожнага руху. І прапанавалі звяртаць увагу толькі на тыя правапарушэнні, якія звязаныя з парушэннем грамадскага парадку.

Не дзіва, што над статутам працуюць так доўга. Як адзначыў у сваім выступленні рэктар БДУ Аляксандр Уладзіслававіч Казулін, статут — гэта наша канстытуцыя, і пажадана, каб ён дзейнічаў сапраўды вельмі доўга і не змяняўся.

На гэтым жа пасяджэнні камісія па стварэнню сімволікі БДУ прапанавала на разгляд членаў Вучонага савета эскізы новай сімволікі універсітэта, якая стане своеасаблівай візітоўкай нашай альма-матэр. Вырашана аб'явіць конкурс на лепшую сімволіку універсітэта.

Так што з наступнага года мы будзем жыць пад уласным сцягам і па новаму статуту.

Таццяна КУХАРЧУК

Конкурс

Дзяржаўны камітэт па справах моладзі Беларусі, Міністэрства адукацыі і Міністэрства культуры Беларусі, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Камітэт па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама абвяшчаюць аб адкрыцці рэспубліканскага літаратурнага конкурсу "Дэбют".

Конкурс праводзіцца з верасня 1997 года па лістапад 1998 года ўключна ў чатыры туры.

I тур: верасень-лістапад 1997 года. У гэты перыяд конкурс будзе праводзіцца на месцах (ва ўстановах і арганізацыях).

II тур: снежань 1997 года — люты 1998 года. Гарадскія і раённыя конкурсы.

III тур: сакавік-май 1998 года. Абласныя конкурсы.

IV тур: чэрвень-лістапад 1998 года. Рэспубліканскі конкурс.

Узрост удзельнікаў — ад 14 да 30 гадоў.

Работы на конкурс прадастаўляюцца ў машынапісным варыянце ў двух экземплярах на беларускай або рускай мовах. Тэматыка твораў — на выбар аўтараў. Жанры конкурсу — апавяданне, нарыс, верш, байка, п'еса. Аб'ём твораў не большы за 3-5 машынапісных старонак.

Творы на конкурс прадастаўляюцца на адрас: вул. Бабруйская, 7, пакой 417. Тэл.: 268-70-98.

Канкурсанты павінны ўказаць сваё прозвішча, імя, імя па бацьку, дату нараджэння, месца навучання, хатні адрас і тэлефон. Работы аўтарам не вяртаюцца.

Пераможцы рэспубліканскага тура будуць запрошаныя на ўрачыстае мерапрыемства ў Брэст, дзе і адбудзецца ўзнагароджанне. Лепшыя творы будуць апублікаваныя ў зборніках прозы і паэзіі маладых талентаў Беларусі.

Аб'явы

Ліцэй Белдзяржуніверсітэта

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад настаўнікаў:
- фізікі;
- грамадскіх дысцыплін;
- рускай мовы і літаратуры.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Адрас: г.Мінск, вул.Маякоўскага, 96, тэл. 221-04-10.

18-20 лістапада адбудзецца святкаванне 75-годдзя біялагічнага факультэта.

У праграме — юбілейная навукова-метадычная канферэнцыя "Дасягненні сучаснай біялогіі і біялагічная адукацыя", якая будзе праходзіць 18-19 лістапада. Апрача таго 20 лістапада адбудзецца юбілейнае пасяджэнне Савета факультэта. А завершыцца свята спектаклем біятэатра і дыскатэкай.

Мы і Сусвет

БДУ ў сузор'і Андрамеды

30 кастрычніка ў дзень 76-й гадавіны з дня заснавання Белдзяржуніверсітэта. Яго студэнты і супрацоўнікі ўпершыню змаглі ўбачыць "няўзброеным" вокам зорку БДУ, назву якой замацаваў сваім подпісам год назад прэзідэнт ЗША Біл Клінтан.

Група супрацоўнікаў навукова-інжынернага цэнтра універсітэта пад кіраўніцтвам Ігара Рудога распрацавала і зрабіла дзейны макет зорнага неба ў той яго частцы, дзе знаходзіцца сузор'е Андрамеды.

Цяпер за палётам зоркі БДУ ў часе і прасторы можна прасачыць прама з вестыбюля галоўнага корпуса універсітэта.

П.ДАРАШЧОНАК

Ведай нашых!

Мы працягваем КВЗ...

Гэтая гульня Клуба вясёлых і знаходлівых была зусім не падобнай да іншых. Ніколі яшчэ і ніводнай камандзе за дзесяць гадоў, як аднавілася папулярнейшая гульня шасцідзесятых, не дазвалялася выступаць з двума прывітальнымі словамі запар. 1 лістапада такое выключэнне было зроблена ўпершыню для каманды КВЗ БДУ — сапраўднага члена Астанкінскага Клуба вясёлых і знаходлівых. Упершыню Аляксандр Маслякоў, хоць (па яго ўласнай заяве) вядучы на КВЗ — асоба другасная і службовая, сапраўды адпачыў. Яму не давялося кідацца на амбразуру падчас безвыходных сітуацыяў на сцэне і запаўняць паузы жартамі. Ён заняў месца звычайнага гледача ў партэры канцэртнай залы "Мінск" і (будзем спадзявацца, на карысць усіх паклоннікаў гульні) нарэшце займеў магчымасць зірнуць на прадстаўленне вачыма абывацеля.

На гэты раз абыйшліся і без суровага журы, калі не ўключаць у яго ўсю паўтаратысячную аўдыторыю гледачоў. Дый спаборніцтва было ўмоўным: балы выстаўляліся ў дэцыбелах смеху. Затое ўручалася шмат каштоўных прызоў — ад футравай ружовай пантэры да некалькіх камандаў-фаварытаў КВЗ накшталт "Новых армян", "Махачкалінскіх бадзяг", якіх прывёз з сабой прэзідэнт Клуба. (Аляксандр Васільевіч застаўся верным традыцыі КВЗ ніколі не прэзентаваць нічога, што мела б грашовае выражэнне.) Чым выкліканыя такія змены? Звычайным святам нашай каманды — "кавээншчыкі" БДУ адзначалі дзесяты дзень нараджэння. Па меркаванню Аляксандра Маслякова, тэрмін сапраўды унікальны, таму што звычайна каманды КВЗ так доўга не жывуць. А доўгажыхарства — сведчанне таго, што ў БДУ каманда сапраўды моцная, нягледзячы на тое, што ў гэтым годзе яна пажадала зрабіць перапынак.

Зала была настроена вельмі добразычліва, таму што на кожным другім крэсле сядзеў калі не былы ўдзельнік, то сваяк ці блізкі знаёмы тых, хто ўдзельнічаў у сцэнічным дзействе. Адсутнічаў толькі былы сцэнарыст і рэжысёр каманды Андрэй Андрэеў. У памяць аб ім прагучалі апладысменты ўсёй залы, якіх пры сваім жыцці Андрэй, магчыма, атрымаў намнога менш, чым заслугоўваў.

Імяніннікаў віншавала таксама прыгожая палова былой каманды "БДУ-МДМІ", а таксама прадстаўнікі дваццаці калектываў універсітэцкіх КВЗ, створаных амаль на кожным факультэце.

Высвятлілася таксама, што капітан каманды "Махачкалінскія бадзягі" Шабан мае ўсе шанцы ў хуткім часе стаць прарэктарам універсітэта, а каманда БДУ, калі добра папрацуе,— нават атрымаць уласны асобны будынак.

У адказ на гэтую прапанову рэктара прэзідэнт КВЗ Аляксандр Васільевіч Маслякоў параіў:

— Рыхтавацца ўсё ж лепей у сваім памяшканні.

— Як скажаце, Аляксандр Васільевіч,— парыраваў Аляксандр Уладзіслававіч.

— Я, у прынцыпе, зрабіў усё, што мог,— паведаміў Маслякоў членам каманды БДУ.— Так што справа зроблена.

— Сяброўства заўсёды мацнейшае за кінжал, кулі, палітычныя гульні. Таму мы шчыра радуемся поспеху КВЗ Дагестанскага універсітэта, які перамог нашу каманду ў сумленнай барацьбе,— заўважыў рэктар Белдзяржуніверсітэта Аляксандр Уладзіслававіч Казулін і выказаў спадзяванне, што ў новы сезон каманда ўвойдзе ў поўнай баявой форме.

— Цяжка нешта падарыць камандзе, у якой ёсць усё, — паскардзіўся пасля таго рэдактар КВЗ Міхаіл Марфін.— Зразумела, можна падарыць любоў, але ж сэрца я аддаў гэтай камандзе пяць гадоў назад і назаўсёды

Што да гледачоў, то і яны, мяркуючы па бурных авацыях, не супраць падзяліцца любоўю. А напрыканцы юбіляры атрымалі велізарны торт. Як сімвал салодкага жыцця на другім дзесяцігоддзі.

Марына АВЕРКІНА

Нашы біёлагі і ў Кембрыджы лепшыя

Біялагічны факультэт БДУ за тры чвэрці стагоддзя прайшоў вялікі шлях, які шчыльна звязаны з развіццём літаральна ўсіх галін біялагічнай навукі ў рэспубліцы. Аб гісторыі яго стварэння, асноўных напрамках развіцця, аб людзях і надзённых справах біяфака расказвае нашаму карэспандэнту дэкан факультэта, дацэнт Уладзімір Васільевіч Лысак.

— Уладзімір Васільевіч, раскажыце, калі ласка, пра першыя крокі біялагічнага факультэта.

— Біялагічны факультэт — адзін з самых старэйшых у нашым універсітэце. У 1922 годзе было створана прыродазнаўчае аддзяленне педагагічнага факультэта, у якое ўваходзілі тры кафедры — батанікі, заалогіі і фізіялогіі жывёл. З гэтага часу на Беларусі пачалася сістэматычная падрыхтоўка спецыялістаў-біёлагаў. Навуковыя кадры былі запрошаны з Расіі, у прыватнасці з Маскоўскага і Казанскага дзяржаўных універсітэтаў. У 1931 годзе быў арганізаваны біялагічны факультэт. Першым дэканам стаў Яўген Міхайлавіч Зубковіч. У тыя часы выпускі біяфака былі невялікімі — па 10-20 чалавек штогод, а асноўнымі накірункамі навуковых даследаванняў — вывучэнне флоры і фауны Беларусі, фізіялагічныя працэсы ў раслінай клетцы, функцыянальнай марфалогіі жывёл і фізіялогіі чалавека.

— Якія вядомыя ў Беларусі людзі вучыліся на біялагічным факультэце?

— Наш факультэт скончылі прэзідэнт АНБ у 1992-1997 гадах акадэмік Л.М.Сушчэня, намеснік дырэктара інстытута мікрабіялогіі Нацыянальнай акадэміі член-карэспандэнт Н.І.Астаповіч, члены-карэспандэнты АНБ І.М.Сяржанін, М.Ц.Чайка, В.І.Якушаў, А.П.Астапеня, члены-карэспандэнты АН Украіны А.Ф.Стэльмах, З.З.Фіненка і іншыя. Больш чым пяцідзесяці выпускнікам факультэта прысвоены званні "Ганаровы настаўнік" і "Настаўнік вышэйшай катэгорыі". Усяго ж за гады існавання нашага факультэта дыпломы біёлагаў атрымалі больш за 8 тысяч чалавек, з якіх каля 500 абаранілі кандыдацкія дысертацыі, а 80 — доктарскія.

— Ці пашырыліся ў апошнія гады міжнародныя сувязі факультэта?

— Кожны год мы накіроўваем студэнтаў трэцяга курса на вучобу ў Эдынбургскі універсітэт. Па водзывах выкладчыкаў гэтай ВНУ, нашыя студэнты займаюць у рэйтынгах першыя месцы на працягу некалькіх гадоў. Напрыклад, Вольга Ігнатовіч, якая першая паехала вучыцца за мяжу, скончыла Эдынбургскі універсітэт на "выдатна", стала аспіранткай Кембрыджскага універсітэта. Зараз яна ўжо прадставіла кандыдацкую дысертацыю да абароны. Сёлета Вольга прызнана лепшай аспіранткай гэтага вельмі прэстыжнага універсітэта, яе прынялі ў члены Англійскага згуртавання імунолагаў. Гэта вельмі рэдкая з'ява, каб чалавек, які яшчэ не скончыў аспірантуру, увайшоў у такое згуртаванне.

— Колькі гадоў існуе пры факультэце батанічны сад?

— Сад, заснавальнікам якога быў С.М.Мельнік, быў створаны ў 1930 годзе пры кафедры сістэматыкі раслінаў. Раней ён вандраваў па розных месцах. У 1930-1955 гадах Батанічны сад размяшчаўся на тэрыторыі універсітэцкага гарадка, і тут расло 37 відаў дрэўняных і 19 відаў кустовых раслінаў. З 1965 года ён знаходзіцца на тэрыторыі вучэбна-доследнай гаспадаркі "Шчамысліца". Ад вучэбнай гаспадаркі ён атрымаў яшчэ дэндрарый, які ўключае больш за 250 відаў рэдкіх экзатычных раслін. Дэндрарый быў заснаваны яшчэ ў 1928 годзе па ініцыятыве М.І.Вавілава. У Батанічным садзе была створаная калекцыя рэдкіх і знікаючых раслін, існуе калекцыя трапічных і субтрапічных раслін. У 1986 годзе Дзяржкамітэт па ахове прыроды абвясціў дуброву, размешчаную паміж філіялам БДУ і вучэбнай гаспадаркай "Шчамысліца", помнікам прыроды рэспубліканскага значэння, а выканкам Мінскага абласнога савета народных дэпутатаў перадаў яе пад ахову БДУ. Цяпер калекцыя драўняных, кустовых і травяністых раслін сада налічвае 1300 відаў і служыць базай навуковых даследаванняў тэарэтычнага і прыкладнога характару, з'яўляецца банкам для захавання генафонду расліннага свету.

— Вашы студэнты праходзяць практыку на біястанцыі "Нарач"...

— Усё развіццё пасляваеннай беларускай гідрабіялогіі вельмі шчыльна звязана з Нарачанскай біялагічнай станцыяй, утворанай у 1947 годзе. На азёрах Нарачанскай групы быў праведзены шырокі цыкл работаў па Міжнароднай біялагічнай праграме (МБП). Гэта дало магчымасць унесці возера Нарач у міжнародны спіс вадаёмаў, якія патрабуюць асаблівай аховы. Матэрыялы даследаванняў па МБП неаднаразова разглядаліся на ўсесаюзных і міжнародных нарадах, кангрэсах і сімпозіумах, выдаваліся ў Англіі, ЗША, Польшчы, Чэхаславакіі. Зараз пад кіраўніцтвам загадчыка лабараторыі гідрабіялогіі А.П.Астапені калектыў вырашае задачы, звязаныя з агульнымі фундаментальнымі праблемамі сучаснай гідраэкалогіі, захаваннем прыродных асаблівасцяў, санітарнага стану і якасці вады Нарачы. Дапамагчы ў гэтым зможа новы лабараторны корпус біястанцыі, будаўніцтва якога хутка завершыцца.

— Кажуць, у заалагічным музеі факультэта ёсць шмат унікальных экспанатаў...

— У экспазіцыі музея, якую пачаў збіраць у дваццатыя гады А.В.Фядзюшын, цяпер больш за 6 тысяч экспанатаў. Ёсць там нават мядзведзь, які быў дастаўлены з Радзівілаўскага замка. У адной з пярэдніх лап ён трымаў падсвечнік, у другой — паднос. Тым, хто прыходзіў у госці да Радзівілаў, трэба было, пэўна, класці на яго грошы. У навукова-калекцыйным фондзе налічваецца 125 тысяч адзінак захавання, якія не могуць быць выстаўлены з-за адсутнасці плошчы. Вось пераедзем у новым будынак і разгорнем экспазіцыю.

— А ці ёсць на факультэце жывыя жывёлы?

— Вось ужо тры гады ў заалагічным музеі існуе жывы куток. Там ёсць удавы, пітоны, чарапахі, папугаі і іншыя экзатычныя для нашай рэспублікі жывёлы. Гэта вельмі прываблівае школьнікаў, якія прыходзяць амаль штодня да нас на экскурсіі.

— Як факультэт рыхтуецца да святкавання юбілея?

— У гэтыя дні рэстаўруецца насценная газета "Віта", якая выходзіла на факультэце з 1948 года. Яе нумары будуць развешаныя на калідорах ад трэцяга да восьмага паверха. У ёй — артыкулы студэнтаў, якія праходзілі практыку ў розных кутках Беларусі. Кожная кафедра робіць стэнды, прысвечаныя 75-годдзю, а таксама будуць падрыхтаваныя два агульнафакультэцкія стэнды. На адным з іх будзе адлюстравана гісторыя факультэта, на другім — факультэт і яго жыццё сёння. Акрамя таго, гатовы да друку зборнік навуковых прац супрацоўнікаў факультэта і святочны буклет.

Гутарыў
Пётр ДАРАШЧОНАК,
кіраўнік
прэс-службы БДУ



Вечныя кветкі

Гербарыю, як і біялагічнаму факультэту БДУ, таксама спаўняецца ў гэтым годзе 75. Заснавала яго дацэнт кафедры батанікі Н.Цэтэрман. Падмуркам гербарыя сталі асабістыя калекцыі М.А.Прахіна, сабраныя на пачатку 20-х гадоў у Петрыкаўскім, Тураўскім, Лагойскім, Мсціслаўскім, Аршанскім і іншых раёнах. У той час гербарый флоры Беларусі налічваў 10 578 гербарных аркушаў.

Падчас вайны фондавы гербарый панёс адчувальныя страты. Аднак дзякуючы Н.Цэтэрман удалося часткова захаваць і аднавіць пашкоджаныя ўзоры калекцыі.

Пасля смерці заснавальніцы работа па сістэматызацыі гербарыя вялася на добраахвотных пачатках супрацоўнікамі кафедры і студэнтамі факультэта. Працягвалася праца па вывучэнню флоры Беларусі. І толькі ў 1993 годзе ўпершыню загадчык кафедры прафесар А.С.Шуканаў выдзеліў дзве штатныя адзінкі — загадчыка гербарыя і лабаранта.

У выніку шматгадовых даследаванняў флоры Беларусі супрацоўнікамі кафедры батанікі Ю.А.Бібікавым, Г.І.Зубкевіч, У.У.Чэрнікам, Т.А.Сауткінай пры ўдзеле студэнтаў гербарны фонд значна пашырыўся і стаў больш разнастайным.

Зараз гербарый БДУ складаецца з двух раздзелаў — гербарый па вышэйшых раслінах і гербарый па мікраміцэтах. Першы з іх налічвае больш за 40 тысячаў гербарных аркушаў і займае другое месца ў краіне пасля акадэмічнага. Ёсць таксама і геаграфічны гербарый, сабраны ў запаведніках Асканія-Нова, Стралецкі стэп, Беламорская біялагічная станцыя МДУ, а таксама ў Кіргізіі, Казахстане, на Далёкім Усходзе і ў іншых рэгіёнах былога СССР.

Што ж да калекцыі мікраміцэтаў, запачаткаванай у 1969 годзе выкладчыкам кафедры І.С.Гірыловічам, то яна зараз налічвае больш за 2200 узораў.

Супрацоўнікі гербарыя прадастаўляюць магчымасць карыстацца матэрыяламі асноўнага фонду ўсім зацікаўленым. Інфармацыяй гербарыя карыстаюцца не толькі супрацоўнікі кафедры, але і навукоўцы Батанічнага інстытута ў Санкт-Пецярбургу, Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, гербарыя аддзела флоры і сістэматыкі інстытута эксперыментальнай батанікі АН Беларусі. Звесткі гербарыя выкарыстоўваліся пры напісанні зборніка "Бабовыя Паўночнай Еўразіі", апублікаванага ў 1996 годзе выдавецтвам Royal Botanic Gardens у К'ю. Вядома ж, матэрыяламі гербарыя карыстаюцца студэнты, аспіранты пры падрыхтоўцы курсавых, дыпломных, дысертацыйных працаў. Аднак, на жаль, памеры памяшкання, якое займае гербарый, ускладняюць доступ да калекцыі і працу з ёй.

Зараз супрацоўнікі гербарыя разам з аспірантамі кафедры ствараюць інфармацыйную камп'ютэрную базу данных гербарыя БДУ.

С.М.ДРАБЫШЭЎСКАЯ,
загадчыца гербарыя

Злева направа: лабарант Л. Малішэўская, заг. гербарыя С. Драбышэўская, дацэнт І. Сауткіна

Тэатр адной прэм'еры

Многія пакаленні студэнтаў былі гледачамі і гарачымі прыхільнікамі творчасці самадзейных артыстаў біятэатра, які дзейнічае на факультэце ўжо больш за 20 гадоў. Сёння аб гісторыі і сучаснасці "тэтра адной прэм'еры" нашаму карэспандэнту расказвае кіраўнік біятэатра, дацэнт кафедры мікрабіялогіі Аляксандр Георгіевіч Песнякевіч.

— У 1975 годзе, калі я быў ужо супрацоўнікам біялагічнага факультэта, я прапанаваў тагачаснаму сакратару камітэта камсамола Таццяне Шумілінай зрабіць якое-небудзь цікавае прадстаўленне да свята 1 красавіка. Знайшліся энтузіясты і сярод студэнтаў-старшакурснікаў. Быў абраны прэзідыум з аднаго чалавека — Астапа-Сулейма-на-Берты-Марыі Бендэр-бея. Чыталіся жартаўлівыя вершы, быў даклад аб наскальнай пісьмовасці (мелася на ўвазе тое, што пішуць на партах, і тое, што з гэтага атрымліваецца). Першы раз гэта было на філфаку. Гледачам спадабалася. Спадабалася і тым, хто гэта рабіў. Наступнае, больш буйное, прадстаўленне было праз год. І далей двойчы, а то і чатыры разы ў год мы наладжвалі такія "капуснікі". Паступова гэта стала называцца біятэатрам...

Тады на хімфаку дзейнічаў МХАТ — Малы хіміка-аналітычны тэатр, кампанія людзей, якія рабілі Дні хіміка. Мы прапанавалі для свайго тэатра назву ГАБТ — Галоўны атэістычны біялагічны тэатр, бо тады рабілі паводле рок-оперы "Ісус Хрыстос — звышзорка" свой спектакль пад назвай "Ванька Жукаў — супер-стар". Потым гэтая абрэвіятура знікла, і нас сталі называць проста — біятэатр.

— Што адбылося пасля?

— Паступова гэта перарасло ў Дні біёлага, якія працягваліся 2-3 дні, з масай мерапрыемстваў. Звычайна мы праводзім прэс-канферэнцыю з выкладчыкамі, малюем карціны. Былі Косця Кірыенка, Андрэй і Іра Галдзянковы, Ямінскія Барыс і Алена, Аляксандр Гарошкаў, Дзмітрый Куніцкі. Зараз У.Сянчыла, Ю.Чалы і А.Міцянін — асноўныя артысты тэатра. Каля 20 акцёраў тэатра цяпер сталі кандыдатамі навук, ёсць і доктар біялагічных навук, які жыве ў Санкт-Пецярбургу.

— Ці гучыць у час вашых выступленняў музыка?

— Мы заўсёды выкарыстоўваем музыку. За ўсе гады былі два чалавекі, якія цудоўна валодалі інструментамі,— Л.Скарасцецкая і А.Крывашэеў.

— Біятэатр істотна ўплываў на факультэцкае жыццё?

— Дзякуючы біятэатру былі створаныя такія традыцыі, як пасвячэнне ў студэнты і Дні біёлага. Практычна з нас гэта ўсё і пачалося. Некалькі разоў нас запрашалі ў тыя часы, калі гэта быў шырокі рух, на Дні матэматыкаў, Дні хімікаў... І на Дні біёлагаў у Маскву, Ленінград, Рыгу, Львоў, Вільнюс. Мы таксама неаднаразова прымалі гасцей з гэтых гарадоў, паказвалі розныя міні-прадстаўленні. Але для сябе мы заўжды прыдумваем усё новае.

У нас ёсць яшчэ адно правіла — мы ніколі не карыстаемся чужым, імкнемся зрабіць толькі сваё. Майстэрства ў нас не дужа вялікае. І выйграем мы тым, што са сцэны гучыць нешта такое, што датычыцца тых, хто сядзіць у зале.

— Як да вас трапляюць таленавітыя акцёры?

— Прыходзяць першакурснікі, пытаюцца: "Як трапіць у біятэатр?" Калі вісіць аб'ява, што біятэатр збіраецца ў такі і такі час,— прыходзіць можа кожны. Але большая частка, пасядзеўшы тыдні тры па тры вечары штотыдзень і нічога не бачачы (бо ўсе толькі сядзяць і прыкідваюць: "Ай, гэта нам не падабаецца! А гэта ўжо было!"), сядзіць, сядзіць, сядзіць і не вытрымлівае. Вытрымлівае той, хто сапраўды хоча ўліцца ў гэтую кампанію. І, адпаведна, кожны раз колькасць чалавек іншая. Ёсць касцяк — чалавек 5-6.

— І яны ўсё прыдумваюць?

— Практыка паказала: прыдумаць тое, што мы паказваем, адному ніколі не ўдаецца. Ідэі нараджаюцца ў ходзе размовы, а потым я саджуся і пішу сцэнарый.

Нам падабаецца той момант, калі пачынаецца рэпетыцыя і многае ўдаецца вынайсці па ходу. Большасці даспадобы ўдзельнічаць у творчым працэсе. Вядома ж, яны граюць як могуць, але стараюцца як найлепей.

— Вашыя прадстаўленні адрозніваюцца ад КВЗ?

— Вельмі моцна. Мы ў КВЗ не гуляем, бо шэсць чалавек на сцэне, якія па чарзе жартуюць, — гэта не наш стыль. Нам не падабаецца зададзенасць, якая там ёсць.

Нас пытаюць, чаму мы не імкнемся на тэлебачанне. Гэта не для нас. Мы не хочам рабіць сцэну сваёй прафесіяй. Мы ствараем для сябе, самі вызначаем тэрміны. Тэматыка ў нас у асноўным факультэцкая — жыццё ў інтэрнатах, выкладчыкі... Імкнемся рабіць па-добраму, каб ніхто не пакрыўдзіўся.

— Ці захоўваецца сувязь з былымі акцёрамі?

— Удзельнікі тэатра, якія заканчваюць факультэт, атрымліваюць "вечны білет" на дваіх. На выступленнях прыкладна трэцяя частка залы — гэта нашы выпускнікі, якія прыязджаюць да нас з усёй Беларусі. Тыя, хто "прайшоў" праз тэатр, імкнуцца ў сябе на месцах нешта такое ўтварыць. Напрыклад, Косця Кірыенка, Барыс Ямінскі і Андрэй Галдзянкоў у Інстытуце заалогіі, Саша Гарошкаў у Інстытуце фізіялогіі чалавека, Іра Галдзянкова і Лена Ямінская ў Інстытуце эксперыментальнай батанікі НАН рабілі свае лакальныя выступленні, пасля прыходзілі і паказвалі іх для нас на Днях біёлага.

Вы ведаеце, мы лічым сваім абавязкам не прапускаць ніводзін год. Калі ідзе пасвячэнне ў студэнты — ёсць сур'ёзная клятва, спецыяльная пасвячальная песня. Свая песня існуе для выпускнікоў. І для Дзён біёлага ёсць свая песня: "Дзень біёлага — радасны дзень..."

— Атрымліваецца, што кожнае вашае прадстаўленне — прэм'ера?

— Так, сапраўды. Справа ў тым, што назва "біятэатр" усіх збівае з тропу — мы працуем адзін спектакль і ніколі яго не паўтараем. Гэта "капуснікі". Паўтарыць гэта немагчыма. Мы спрабавалі. Але атмасфера залы... Тэатр наш складаецца з адных прэм'ер. Нешта мы паўтараем, напрыклад, песні, але імкнемся заўсёды нешта змяніць. Апошні наш спекталь складаўся з адных песняў. У нас ёсць энтузіяст — Вадзім Сонкін. Ён тут стварыў ансамбль і хоча нават сабраць ужо другую асобную аўдыякасету песняў з нашых спектакляў. Калі нам удаецца напісаць добрую песню, іх памятаюць нават тыя, хто ніколі не выступаў у біятэатры. Канешне, гэта пераважна песні пра біялогію. Таму біёлагі іх ведаюць.

Дарэчы, на 75-гадовы юбілей факультэта адбудзецца прадстаўленне біятэатра 20 лістапада ў ДК Чыгуначнікаў, дзе пройдзе пасвячэнне ў студэнты першакурснікаў — ім вельмі пашанцавала, што гэтыя падзеі супалі.

Не ведаю пакуль, як усё атрымаецца. Толькі калі мы ўжо ў зале і гледачы смяюцца і апладзіруюць, разумееш, што спектакль удаўся.

Гутарыў
Пётр ДАРАШЧОНАК,
кіраўнік прэс-службы БДУ

Віншуем!

Нобель мог бы пазайздросціць...

Напярэдадні дня нараджэння універсітэта камісія па прэміях імя А.М.Сеўчанкі і У.І.Пічэты, якую ўзначальвае рэктар, вызначыла пераможцаў сярод прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў.

Упершыню такі конкурс навуковых працаў прайшоў ва універсітэце чатыры гады таму. Традыцыйна адбор прэтэндэнтаў абавязкова павінен быў папярэдне праходзіць на навуковай канферэнцыі на факультэце ці ў інстытуце. Сёлета адзінай умовай засталося забеспячэнне галоснасці падчас вылучэння навуковых працаў на конкурс, незалежна ад таго, на канферэнцыі ці Вучоным савеце яно адбудзецца. Памер абедзвюх прэміяў для выкладчыкаў — трыццаць мінімальных заробкаў, для студэнтаў — 10 звычайных стыпендыяў. Стаць лаўрэатам магчыма толькі аднойчы ў жыцці.

Трэба адзначыць, што навуковых працаў на ўдзел у гэтым адказным конкурсе сёлета было вылучана няшмат. Сярод выкладчыкаў — чатыры па гуманітарных навуках і тры па прыродазнаўчых. Ад студэнтаў удзельнічалі таксама чатыры гуманітарных і тры прыродазнаўчых працы. Але ж вызначыць самую якасную з іх і карысную для краіны здавалася амаль немагчыма якраз таму, што спаборнічалі паміж сабой сапраўды выдатныя працы. Камісія ўлічвала навуковую своечасовасць тэмы значнасць і колькасць публікацыяў па працы, актуальнасць яе для Беларусі. І працаваць ёй было нялёгка, як заўсёды (дарэчы, і падчас прысуджэння самай вядомай узнагароды — Нобелеўскай прэміі), калі спаборнічаюць лепшыя з лепшых. Студэнты азадачылі членаў камісіі навыват больш, чым вядомыя навукоўцы: па некаторых працах даводзілася нават перагаласоўваць.

Пераможцам у намінацыі гуманітарных навук сярод выкладчыкаў стаў прафесар, доктар гістарычных навук Валянцін Навумавіч Рабцэвіч за цыкл работаў у галіне нумізматыкі. Сярод прыродазнаўцаў прэмію імя А.М.Сеўчанкі атрымаў прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук Юрый Сямёнавіч Харын за цыкл работаў па тэорыі робаснага статыстычнага распазнавання вобразаў і яе прымянення.

Фаварытамі сярод студэнтаў сталі на гэты раз навучэнцы філасофска-эканамічнага факультэта. Яны прадставілі тры з чатырох "гуманітарных" работаў. Перамог пяцікурснік К.Гайдук, які працаваў па тэме "Інтэграцыйныя працэсы на рынках еўравалютаў і еўраблігацыяў". Лепшай работай студэнтаў-прыродазнаўцаў была прызнаная "Матэрыялы для высокатэмпературных электрахімічных прыстасаванняў" выпускніка хімфака Кавалеўскага.

Рэцэнзенты асабліва адзначылі прадстаўленыя на суісканне прэміі імя У.І.Пічэты манаграфіі прафесара А.М.Елсукова "Пазнанне і міф", "Гісторыя антычнай гнасеалогіі", "Гісторыя сацыялогіі" і цыкл публікацыяў у замежных і айчынных выданнях, прысвечаных праблемам і спецыфіцы сацыяльнага пазнання, а таксама ролю Альберта Мікалаевіча ў заснаванні сацыялагічнай школы на Беларусі.

Вартая пахвалы і праца аўтарскага калектыву ў складзе Л.І.Сямешка, І.Р.Шкраба, З.І.Бадзевіч па стварэнню сучаснага падручніка па беларускай мове, з'арыентаванага на самую шырокую аўдыторыю. Актуальнасць для Беларусі манаграфіі І.А.Чароты "Пошук спрадвечнай існасці: беларуская літаратура XX стагоддзя ў працэсах нацыянальнага самавызначэння" нельга адмовіць. Аўтар спрабуе падрабязна асвятліць праблему еднасці і адрознасці рускага і беларускага народаў у той ці іншы перыяд гісторыі.

Работа яшчэ аднаго прэтэндэнта на прэмію М.В.Коржыка была прысвечана найважнейшаму навуковаму накірунку, звязанаму са стварэннем новых тэхналогіяў і сродкаў вывучэння Сусвету. У выніку выканання цыкла навуковых і эксперыментальных работаў створаны і даведзены да стадыі масавай вытворчасці новы матэрыял — вальфрамат свінца.

Калектыў у складзе С.Чаранкевіча, А.Цімашэнка, Г.Семянковай мае не менш цікавы цыкл работаў — "Працэсы малекулярнага пазнавання і сігналізацыі ў клетках імуннай сістэмы".

Зінаіда МАРАВА

Кніжная паліца

Першы бліН зусім не комам

Выйшаў у свет першы нумар новага навукова-тэарэтычнага часопіса "Сацыялогія", заснаванага Беларускім дзяржаўным універсітэтам.

Часопіс адкрываецца раздзелам "Артыкулы і даклады". Доктар сацыялагічных навук, прафесар А.М.Данілаў у артыкуле "Трансфармацыя: працэс канструявання будучыні" разглядае дыялектычны працэс сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у краінах былога сацыялістычнага лагера пры ўваходжанні іх у рыначную сістэму і неабходнасць у гэтых умовах сустрэчных кампрамісаў Захаду. Аўтар даволі ўдала прасачыў змены эканамічных асноваў грамадства, лібералізацыю грамадскага асяроддзя, пераўтварэнне структуры сацыяльна-эканамічнага развіцця, перамены ў сферы духоўных каштоўнасцяў і прыярытэтаў. На падставе разнастайнага эмпірычнага матэрыялу А.М.Данілаў прыходзіць да высновы, што працэс трансфармацыі (як вынік проціборства дзвюх сістэмаў і паражэння ў гэтым проціборстве Савецкага Саюза) наклаў непазбыўны адбітак на канфігурацыю ўсіх далейшых падзеяў.

Вялікую ўвагу прыцягвае да сябе артыкул доктара палітычных навук, прафесара Вінфрыда Бётчэра (Германія) "Усход змяніў Захад". Аўтар усебакова аналізуе гістарычныя працэсы, звязаныя з распадам СССР. Ён прапануе шляхі выхаду з грамадска-палітычнага крызісу, у якім апынуліся ў сувязі з гэтым як Усход, так і Захад.

На багатым фактычным матэрыяле пабудаваны артыкул доктара філалагічных навук, прафесара Ю.А.Ляведы (Расія) "Комплексы грамадскай думкі". У артыкуле доктара сацыялагічных навук, прафесара М.М.Чурылава (Украіна) "Рэгіянальнае самакіраванне" на аснове ўсебаковага сацыялагічнага аналізу разглядаецца дыялектыка стаўлення розных катэгорыяў насельніцтва Украіны да праблемы рэгіянальнага (мясцовага) самакіравання. Выклікае цікавасць артыкул доктара эканамічных навук, прафесара Л.М.Давыдзенкі і доктара сацыялагічных навук Л.Р.Цітарэнка "Замежны вопыт рэфармавання сацыяльнай абароны насельніцтва".

З цікавымі фактамі і абагульненнямі чытач пазнаёміцца і ў артыкулах доктара сацыялагічных навук, прафесара А.І.Ляўко "Метадалагічныя праблемы сацыялагічнай адукацыі", кандыдата сацыялагічных навук В.В.Цярэшчанка "Дыферэнцыяцыя даходаў як прадмет сацыяльнага даследавання", кандыдата сацыялагічных навук В.Дз.Поя "Вопыт развіцця заходнееўрапейскай інтэграцыі", кандыдатаў філасофскіх навук Н.Я.Галубковай і Н.Р.Новікавай "Асаблівасці ўмоваў першаснай сацыялізацыі асобы і каштоўнаснай структуры свядомасці ў падлеткаў з адхіляючымі паводзінамі", кандыдата сацыялагічных навук А.А.Карасцелевай "Сацыялагічны аналіз палітычнага поля сучаснага беларускага грамадства", доктара сацыялагічных навук С.А.Шавеля "Канцэпцыя і алгарытм пабудовы рэспубліканскай сацыялагічнай рэпрэзентатыўнай выбаркі", доктара філасофскіх навук, прафесара А.М.Елсукова "Кафедра сацыялогіі Белдзяржуніверсітэта сёння".

Думаецца, новае выданне знойдзе сваіх прыхільнікаў. Яно актуальнае для суверэннай дзяржавы, якая шукае сваё месца ў цывілізаваным свеце. Рэдакцыйная калегія падрыхтавала цікавы па зместу і разнастайны па тэматыцы нумар. Праўда, не ўсе аўтары змаглі вытрымаць патрабаванні рэдкалегіі адносна стылю, даходлівасці мовы. Магчыма, яшчэ трэба падумаць над фармулёўкамі і зместам рубрыкаў. Аднак гэтыя прыватнасці не засланяюць галоўнага: першым нумарам часопіса заяўка зроблена. І заяўка добрая. Дык у добры шлях, паважаныя калегі!

Пётр БАРАНОЎСКІ,
адказны сакратар
"Весніка БДУ"

Падпіска- 98

Працягваецца падпіска на газеты і часопісы на першае паўгоддзе 1998 года. Падпісная цана на часопіс "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" па серыях выглядае так:
Серыя I (індэкс 74851) — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 1, студзень, № 2, май) — 40 000 рублёў;
Серыя II (індэкс 74852) — хімія, біялогія, геаграфія (№ 1, люты, № 2, чэрвень) — 40 000 рублёў;
Серыя III (індэкс 74853) — гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 1, сакавік) — 20 000 рублёў;
Серыя IV (індэкс 74854) — філалогія, журналістыка, педагогіка, псіхалогія (№ 1, красавік) — 20 000 рублёў.
Падпіска на часопіс "Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта" прымаецца ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.
Нагадваем, што ў рознічны продаж часопіс не паступае.

Беларусы ў горадзе Этампе, а таксама на данжоне Гінет

Нашыя сувязі. У апошнія гады гістарычны факультэт БДУ значна пашырае сувязі з замежнымі ўстановамі і навуковымі цэнтрамі свету. Нямала такіх прыярытэтных справаў праведзена сумесна і з французскім бокам. Напрыклад, на архіўным аддзяленні наладжаная сувязь з прадстаўнікамі Парыжскага універсітэта. Былі арганізаваныя і зараз чытаюцца перад студэнтамі спецыяльныя курсы лекцыяў. Распачалася дзейнасць суполкі "Сябры архіваў" з ліку тых, хто вывучае французскую мову. У мінулым навучальным годзе праведзены архіўны семінар "Архівы на шляху ў XXI стагоддзе", дзе гасцямі студэнтаў і запрошаных спецыялістаў Дзяржаўнага камітэта па архівах і справаводству, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь былі найбольш вядомыя ў Францыі архівісты — Элізабет Рабю (генеральны інспектар Францыі) і Крысцін Пеційя (дырэктар Цэнтра сучасных архіваў, дзе захоўваецца больш дакументаў, чым ва ўсіх дзяржархівах Беларусі).

Пасля першага сумеснага міжнароднага беларуска-французскага семінару ў гісторыі архіўнай справы рэспублікі вырашана ўжо ў гэтым навучальным годзе арганізаваць наступны — "Архівы XXI стагоддзя", правесці шэраг навуковых канферэнцыяў. Спрыяе пашырэнню сувязяў арганізаваны французскім бокам навуковы абмен — працяг вучобы архівістаў на базе адной з навучальных устаноў. Так, адзін з першых выпускнікоў аддзялення Ігар Лялькоў на працягу года будзе рыхтаваць навуковую працу ў Мелузскім універсітэце. Адкрываюцца магчымасці і па замежных стажыроўках для нашых маладых спецыялістаў.

Сёлета па запрашэнню французскіх спецыялістаў археалагічнай справы і "Сяброў каралеўскага замка ў Этампе" невялікая група студэнтаў БДУ ўпершыню ўдзельнічала на працягу жніўня 1997 г. у раскопках сярэднявечнага замка блізу Парыжа. Гэта стала магчымым дзякуючы падтрымцы намаганняў студэнтаў і выкладчыкаў з боку рэктарата, кіраўніцтва гістарычнага факультэта і асабіста яго дэкана А.А.Яноўскага.

Практычны бок. Гэта першая магчымасць атрымаць асабістае і непасрэднае ўяўленне аб стане археалагічнай справы ў Францыі, яе практыцы і методыцы. Дарэчы, да гэтага моманту ніхто са спецыялістаў археалагічнай справы Беларусі не змог прыпомніць, каб такія магчымасці мелі месца. Таму пэўная перасцярога да нашага ўдзелу ў раскопках была відавочнай. Хаця, вядома ж, факультэт мае добры ўзровень археалагічнай працы: дзейнічае адпаведная кафедра, штогод праводзяцца раскопы.

У гэтым праекце разам з прадстаўнікамі Каралеўскага таварыства ўдзельнічалі студэнты універсітэтаў Сарбоны, Нанта, Грэнобля, ліцэісты Парыжа, Мілана (Італія), якія спецыялізуюцца па пытаннях сярэднявечча і, як правіла, маюць пэўны вопыт археалагічных раскопак. Гэта давала магчымасць больш шырока весці абмен вопытам.

Да таго ж, кожны з нас меў магчымасць практычнымі намаганнямі спрыяць захаванню аднаго з старадаўніх каралеўскіх замкаў Францыі, удзельнічаючы ў нацыянальнай французскай праграме РАМПАР, разлічанай на добраахвотную (а таму і без грашовай аплаты) працу.

А яшчэ мы атрымалі магчымасць глыбейшага знаёмства з багатай культурай Францыі, асабліва з яе гістарычнымі помнікамі і, безумоўна, цікавымі людзьмі.

Умовы ўтрымання ўдзельнікаў раскопак былі звычайнымі: бясплатнае пражыванне, а таксама харчаванне (для беларускага боку) і — што вельмі радавала — культурная праграма была спланаваная праз кожныя два дні.

Удзельнікі раскопак. На жаль, асабістае фінансаванне шляху вытрымалі толькі чатыры чалавекі. Гэта Аляксей Махнач — студэнт трэцяга курса, зацяты археолаг, які меў ужо вопыт раскопак не толькі ў Беларусі, але і ў Польшчы. Ён ехаў з жаданнем арганізаваць у будучым раскоп на роднай Браслаўшчыне, дзе маглі б прыняць удзел і замежныя студэнты. Ігар Сідаровіч — студэнт пятага курса завочнага аддзялення, паплечнік Аляксея не аднаго археалагічнага сезона. Выпускніца музейнага аддзялення Вольга Прадун дамаглася ажыццявіць сваю мару — убачыць Парыж, прыняць удзел у працы, абнавіць свае веды культурным знаёмствам з музейнымі ўстановамі Францыі. Весці агульныя пытанні па арганізацыі гэтага мерапрыемства, быць перакладчыкам і разам з іншымі працаваць давялося асабіста мне

Крыху гісторыі аб горадзе Этампе і данжоне Гінет. Першае знаёмства з горадам Этампам і башняй Гінет уражвала багатай гісторыі і прыгажосцю мясцінаў. У манускрыптах ёсць звесткі аб разбурэнні Этампа нарманамі ў 911 г. Ён займаў значнае геаграфічнае становішча, што ў хуткім часе вылучыла яго ў адзін з найбольш багатых гандлёвых гарадоў Францыі. (Невыпадкова ў хуткім часе ён стаў уласнасцю каралеўскай дынастыі Капетынгаў). Для абароны яго і быў на ўзвышшы ўзведзены ў 1130-1150 гг. (верагодна, па рашэнню французскага караля Рабера Набожнага) першы данжон з каменя ці дрэва. Цягам гадоў ён быў рэканструяваны і дабудаваны каралямі Луі VI і асабліва Філіпам-Аўгустам, які быў заняты ўзвядзеннем умацаванняў, адбудовай крэпасцяў гарадоў.

Такім чынам, каралеўскі замак у Этампе разам з чатырохпавярховай вежай-данжонам вышынёй 27 м заставаўся месцам рэзідэнцыі каралёў Францыі аж да канца сярэднявечча. Маючы вельмі добрае геаграфічнае становішча паміж рэкамі Сенай і Луарай, ён з XI-XII стст. стаў месцам правядзення пяці царкоўных сабораў, два з якіх мелі нацыянальны характар. У той час па колькасці насельніцтва горад не саступаў сталіцы. Ён забяспечваў прадуктамі харчавання не толькі свой рэгіён, а і Парыж. Гэтаму спрыяла заснаванне вялікіх гандлёвых рынкаў і кірмашоў, наяўнасць рэкаў Луэт і Шалуэт. Невыпадкова гэты горад быў месцам знаходжання караля Францыі Луі VII, каралевы Канстанцыі, а на працягу XVI ст. там пражывалі Франсуа I, Генрых II і Генрых IV. Калі графства Этамп стала герцагствам, то замак стаў рэзідэнцыяй і для іх фаварытаў, асабліва для Ганны Піселю, Дзіяны Пуацье і Габрыэлы Эстре.

Знакаміты ён яшчэ і тым, што тут значылася гістарычнае месца падчас барацьбы арманьякаў і бургіньёнаў (1411 г.). У выніку рэлігійных войнаў паміж пратэстантамі і католікамі горад пераходзіў з рук у рукі. Нішчылася фактычна ўсё, асабліва калі гэта мела дачыненне да духоўнай справы. Практычна, кожны лічыў сваім абавязкам і славай дамагчыся гэтага каралеўскага замка. Насельніцтва горада не ведала спакою і ў час барацьбы войскаў караля і прынцаў.

XVI ст. стала самым значным у гісторыі замка. У 1589 г. жыхары Этампа вырашылі, што замак стаў прычынай іх няшчасцяў, а горад страціў сваё стратэгічнае ваеннае палажэнне. Яны звярнуліся асабіста да караля Генрыха IV з просьбай аб разбурэнні ўмацаванняў. Праўда, і да 1652 г. ён не страціў свайго добрага архітэктурнага стану, а пазней руіны замка былі прыстасаваныя да месцазнаходжання галубоў караля Луі XVI.

У час рэвалюцыі гэтыя гістарычныя месцы былі аб'яўленыя нацыянальным багаццем Францыі. Сёння руіны данжона — сведкі мінуўшчыны. Паблізу яго размешчана Пергала — дэкаратыўны скульптурны манумент з каменя і дрэва, які паказвае карціны розных часоў і тэмаў і выкананы сусветна вядомымі мастакамі, сярод якіх Франсуа Панпон, Восіп Цадкін і іншыя.

Характарыстыка царкоўных пабудоваў. У горадзе з XI ст. існавалі шэсць цэркваў (Святых Базыля, Мартына, Жыля, Нотр Дам; саборы Святога Пятра і Святога Крыжа не захаваліся), якія характарызуюць старадаўнюю гісторыю. Так, царква Святога Базыля была пабудаваная ў пачатку XI ст. каралём Рабэрам II Набожным у найбольш багатай частцы горада. Да нашага часу захаваліся архітэктурныя асаблівасці XVI ст. Царква Нотр Дам была таксама заснаваная каралём у 1025 г. Дарэчы, нам давялося бачыць адну з першых раннегатычных скульптураў XII ст., якая захавалася на парталах царквы. На жаль, падчас рэлігійных войнаў наяўныя іканастасы (асабліва партралы) часткова былі разбітыя ў 1562 г. прыхільнікамі гугенотаў. Пад гук звона, узнятага на 55-метровую вышыню, у царкве адбываліся самыя значныя каранацыі, рэлігійныя святкаванні, рэвалюцыйныя святы горада і інш. Маляўнічыя вітражы XVI ст. даносілі да прысутных святасць, цеплыню і значнасць падзеі.

У царкве Святога Жыля нам давялося бачыць невялікую выставу, прысвечаную падзеям Другой сусветнай вайны, калі падчас бамбардзіровак амерыканскай авіяцыі ў 1944 г. загінула каля 400 чалавек, пераважна мірных жыхароў Этампа. Царква была ператвораная ў руіны. Усё ж удалося захаваць малюнкі XVI ст., каменныя сярэднявечныя хімеры на сценах.

Мы часта наведвалі царкву Святога Мартына — самы старадаўні (XII ст.) і практычна цалкам захаваны будынак. Ён адметны сваёй абарончай архітэктурай і капліцай, якая нагадвала Пізанскую вежу. Калі майстры яе будавалі, то, выпраўляючы нахіл, зрабілі яе ўвагнутай. Нас запэўнілі, што небяспекі няма, а гэтым яна яшчэ больш вабіць прыхаджанаў і асабліва сучасных турыстаў.

Праца. Першы этап. Трэба зазначыць, што французскае зананадаўства акцэнтуе ўвагу на захаванні гістарычных помнікаў. Напрыклад, адпаведныя законы, пачынаючы з 1860 г. і з пашырэннем 1913 г., 1930 г., працуюць і да сённяшняга дня. Таму мінуўшчына — пастаянны аб'ект увагі гісторыкаў, мясцовых актывістаў. Таварыства "Сябры каралеўскага замка" вырашыла ўзнавіць выгляд старажытнага замка. Па старадаўніх гравюрах (1411 г.). быў распрацаваны план пабудовы. Гэта дазволіла ў 1996 г. пры дапамозе адзінаццаці маладых асобаў з Францыі, Італіі і В'етнама распачаць археалагічны зандаж. Падчас першага раскопу былі вызначаныя месцы сценаў, якія часткова захаваліся, вызначаныя іх канструкцыя, памеры.

Другі этап. Гэтым летам сустрэліся дваццаць маладых спецыялістаў і па ўжо вызначаму плану працягнулі раскоп. Так, даводзілася крышку здзіўляцца, што французскі бок выкарыстоўвае маламагутны экскаватар для зняцця верхняга слою, раскрыцця формаў аб'екта. Спачатку беларуская група вяла раскоп аднаго з месцаў, дзе меркавалася знаходжанне невялікай башні. На вялікі жаль, калі амаль былі вызначаныя яе формы, нейкі вандал (сапраўды, такія асобы ўсюды ёсць) папсаваў іх.

Практычна, кожны ўдзельнік беларускай групы працаваў разам з іншымі ўдзельнікамі на розных месцах. Былі адкрытыя месцы знаходжання вежы, сценаў, пашыраныя месцы першага раскопу, знойдзеная кераміка, побытавыя рэшткі чалавечай дзейнасці і інш. Крыху пазней, пры дапамозе лабараторных сродкаў аналізу ў Арлеане, вынікі будуць вядомы.

У выніку, матэрыялы раскопак дазволілі запэўніць членаў гарадскіх органаў кіравання, а таксама прадстаўнікоў дэпартамента, міністэрства культуры ў неабходнасці фінансавання раскопак і працягу іх у наступным годзе, але ў большым маштабе і на больш высокіх прафесійных асновах.

Падарожжы. Этамп вабіў сваёй блізкасцю да Парыжа — усяго каля гадзіны падарожжа на транспартным сродку. Наваколле прываблівала прасторай далінаў, узвышшаў, лясістых прыгоркаў і блізкасцю да замкаў Шамаранд і Фаршавіль. Цікавым было наша першае знаёмства з Эйфелевай вежай, праменад па Елісейскіх палях, наведванне царквы Нотр Дам, музея Луўра, Нацыянальнага цэнтра мастацтва і культуры Жоржа Пампіду. Паспяховымі былі візіты ў сярэднявечныя гарады і знаёмства з імі: Версай (Версаль), Фантэнбло, Арлеан, а таксама Безансон, Вільканэн, Невіль дэ Пуату і інш. Нам нават давялося пабываць на былой натаўскай базе, дзе функцыянуе Цэнтр сучасных архіваў (Фантэнбло). Яго дырэктар, якая была ў БДУ ў час архіўнага семінара, шчыра прымала за сямейным сталом нашу невялічкую дэлегацыю.

Навуковы і культурны абмен. У час дыскусіяў і навуковых сустрэчаў вялікую цікавасць вызвалі напрацоўкі беларускіх археолагаў, якія былі прадстаўленыя кніжкамі, манаграфіямі, энцыклапедычнымі даведнікамі Г.В.Штыхава, Ю.А.Зайца, А.А.Егарэйчанкі, фотаздымкамі кіраўніка раскопу ў Капылі Лявона Калядзінскага, студэнта Аляксея Махнача. Замежным калегам было цікава бачыць нашыя краявіды, пазнаёміцца з багата прадстаўленымі матэрыяламі аб факультэце і самім універсітэце. Адчувалася іх жаданне даведацца пра наш край. Падчас беларускай вечарыны Вольга Прадун, як гаспадыня, частавала сяброў традыцыйнай беларускай ежай: баршчом, галубцамі, бульбянымі блінамі і сапраўднай "крышталеўскай" юбілейнай бутэлькай гарэлкі.

Час знаходжання ў Францыі — гэта і знаёмства з шчырымі французскімі студэнтамі і спецыялістамі. Прэзідэнт асацыяцыі "Сябры каралеўскага замку ў Этампе" Філіп Маро як прафесійны архітэктар высока ацаніў працу і выказаў жаданне пашырыць сяброўскія беларуска-французскія зносіны ўжо на наступны год. З багаццем дакументальных крыніцаў горада пазнаёміў нас загадчык архіву, шчыры і сімпатычны выпускнік Страсбургскага універсітэта Клеман. Прыемны ўспамін застаўся пра нашу зямлячку Наташу і яе сябра Жана, якія сталі добраахвотнымі памочнікамі тым, хто хацеў пазнаёміцца з культурай Францыі.

На прыёме ў мэрыі падчас сустрэчы з прадстаўнікамі міністэрства культуры беларускаму боку была выказана падзяка і жаданне зноў бачыць пры выкананні добрых навуковых справаў. Таму на наступны год могуць быць заяўленыя некалькі групаў з ліку студэнтаў і аспірантаў. Гэта дазволіць працаваць у розных месцах Францыі. Верагодна, і з французскага боку на наступнае лета прыедуць да нас студэнты.

У родным універсітэце нас чакала прыемная сустрэча з дэканам факультэта. Вырашана, што сабраныя відэа- і дакументальныя матэрыялы павінны стаць добрай навукова-метадычнай асновай не толькі для археогаў, але і для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Францыі. На наступны год будзем рыхтавацца да сустрэчы.

К.І.КАЗАК,
дацэнт кафедры
крыніцазнаўства
і музеязнаўства
гістарычнага факультэта

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Заснавальнік газеты - БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана на Мінскай паліграфічнай фабрыцы "Чырвоная зорка" МВПА імя Я.Коласа. 220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.
Ум. друк. арк. 1
Падпісана ў друк у 12.00.

6 ЛІСТАПАДА
Зак. 1798
Т. 1000 экз.

Бясплатна

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 9, паверх 4, пакоі 411-412, тэлефон 2206827.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР